# Патрэбна адзінства

**Алег ДЗЯЧЭНКА, член Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь сёмага склікання ад Магілёўскай вобласці:**



— Выбары адбыліся, і людзі ўжо вызначыліся, хто павінен кіраваць краінай. Зараз усім нам неабходна працаваць далей, каб развіваць вытворчасць, нарошчваць аб'ёмы экспартных продажаў, у спакойнай абстаноўцы завяршыць уборку ўраджаю, падрыхтавацца да пачатку новага навучальнага года, не дапусціць успышкі другой хвалі каранавіруса. Адным словам, аператыўна вырашаць жыццёвыя для нашага народа задачы. Дзеля гэтага ўсім удзельнікам палітычнага працэсу трэба супакоіцца, спыніць спрэчкі і на аснове агульнанацыянальных інтарэсаў працягнуць сумесную работу па ўмацаванні дзяржаўнасці, незалежнасці, абароне тэрытарыяльнай цэласнасці Беларусі. Гэта сёння галоўнае.

Беларускаму народу як ніколі раней патрэбна палітычнае, ідэалагічнае і рэлігійнае адзінства. Трэба ўлічваць інтарэсы і тых, хто сёння прытрымліваецца іншай думкі наконт далейшага дзяржаўнага будаўніцтва. Неабходна дамаўляцца па спрэчных пытаннях. Будзем памятаць, што толькі ва ўмовах грамадзянскага міру і згоды мы зможам пераадолець тыя праблемы, якія існуюць у нашай краіне.